# РОЛЯ БЕЛАРУСКІХ ПАЭТЭС У НАЦЫЯНАЛЬНА-АДРАДЖЭНСКІМ РУХУ НА БЕЛАРУСІ ПАЧАТКУ XX ст.

**Чмарава Марына Іванаўна**
дацэнт кафедры літаратуры і міжкультурных камунікацый установы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова”;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
**Борбат Таццяна Іванаўна**
дацэнт кафедры літаратуры і міжкультурных камунікацый установы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова”;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Паводле сведчання Ніны Мячкоўскай, “у параўнанні з культурамі чатырох суседніх народаў (палякаў, літоўцаў, рускіх, украінцаў) беларуская культура выглядае як найбольш маскулінная, бо ў побыце і ментальнасці беларусаў, у параўнанні з суседзямі, найбольш уплывовымі былі і ёсць сялянскія складнікі” [1, с. 249].

У дарэвалюцыйнай Расіі пераважна сялянская Беларусь была далёкай ад асветы, пры гэтым жанчыны – значна болей, чым мужчыны. Паводле ментальнасці беларускага селяніна, кніга магла займаць нейкае, хай і далёка не першае, месца ў лёсе мужчыны, але не жанчыны [1, с. 249]. Тым не менш, гэты ўплыў меў месца, і ўвага да яго дазваляе ў поўнай меры пашырыць уяўленні пра складнікі беларускага Адраджэння пачатку XX стагоддзя.

Сапраўды, уваходжанне беларускіх жанчын у сферы грамадскага развіцця павінна было пераадолець эвалюцыйныя этапы, ствараючы новыя абрысы жаночай думкі ўвогуле.

Паступова жаночая ідэя набывае нацыянальна-вызваленчы характар. Сёння з упэўненасцю можна сцвярджаць, што жаночая думка Беларусі XX стагоддзя фарміравалася ў кантэксце барацьбы народа за перспектывы незалежнасці краіны. У зводзе народнага светапогляду сцвярджалася права жанчын на свабоду, унутранае жыццё і моцныя пачуцці. Хаця доўгія стагоддзі прыгнёту пакінулі адбітак на жаночых лёсах і ў жаночым светаразуменні, нязменным заставаўся стрыжань – статус захавальніцы нацыянальнага быцця, мовы і культуры, нацыянальных традыцый. Асабліва важным было тое, што жанчына перадавала ў спадчыну новым пакаленням іх родную мову.

Такім чынам, вобраз Радзімы заўсёды яднаўся з вобразам беларускай жанчыны-захавальніцы, жанчыны-змагаркі.

У гісторыі “нашаніўскага” адраджэння жаночыя постаці – гэта прывабныя і прыгожыя маладыя жанчыны, поўныя жыццёвых сіл і розных талентаў, каханыя і закаханыя, самаадданыя, часам самаахвярныя і разам з тым – жыццелюбівыя і вельмі жыццетрывалыя. Яны не былі лідаркамі руху (ды лідарства – гэта і не жаночы занятак), але яны былі ў цэнтры ўвагі побач з мужчынамі. Ім прысвячалі вершы, іх імёнамі называлі п’есы (“Паўлінка”), рэдагавалі іх уласныя вершы (Канстанцыя Буйло, зборнік “Курганная кветка”). Акрамя Цёткі (Алаізы Пашкевіч), сярод дзеячак “нашаніўскага” адраджэння не было сапраўдных палітычных натур, рэвалюцыянерак, тым больш тэрарыстак.

У канцы XIX – пачатку XX стагоддзя, з развіццём грамадскіх супярэчнасцяў, узнікла сітуацыя жаночага масавага процістаяння старым умовам, адсталаму сацыяльнаму дыктату. На агульным шэрым фоне сацыяльна-эканамічнага і палітычнага ўціску з’явілася перспектыва: у беларусаў узнікла магчымасць пасля атрымання першапачатковай адукацыі ў часовых “дарэктараў” ці на курсах працягваць вучобу ў такіх буйных гарадах, як Масква, Санкт-Пецярбург, Варшава. Калі нават у Заходняй Еўропе жанчына-адвакат ці ўрач успрымалася як грамадская анамалія, то жанчыны з беларускіх двароў бясстрашна ад’язджалі ў вядомыя ўніверсітэцкія і прамысловыя цэнтры імперыі і нават за яе межы. Яны ад’язджалі ад роднае хаты не толькі ў пошуках сямейнага шчасця, але найперш з надзеяй атрымаць роўную з мужчынамі адукацыю, што асацыявалася з набыццём пэўнай свабоды, пачуцця годнасці. Пачынаўся перыяд ломкі патрыярхальнага погляду на адукацыю і сацыяльную ролю жанчын. Узніклі першыя жаночыя вышэйшыя курсы, асабліва педагагічныя і медыцынскія, першыя грамадскія жаночыя аб’яднанні.

Пачынаецца актыўная дзейнасць беларускіх патрыётак, якія не саступалі мужчынам ні ў навуковай, ні ў асветніцкай, ні ў палітычнай актыўнасці. У той жа час мацнее і шырыцца іншы жаночы рух. На арэну барацьбы выходзіць яшчэ малавядомая, але моцная жаночая грамада – работніцы і сялянкі, якія шукаюць шляхі да вызвалення і адукацыі. Вось чаму пачынальніца масавага жаночага беларускага руху, паэтэса Цётка, была, акрамя ўсяго, і стваральніцай новай канцэпцыі нацыянальнай асветы, у тым ліку жаночай. Пры яе актыўным удзеле эпоха нацыянальнага Адраджэння пачатку XX стагоддзя рашала задачы легітымізацыі беларускай мовы, прэсы і культуры. І жанчыны, якія ў гэтым удзельнічалі, былі натхнёныя найперш нацыянальнай ідэяй.

Асабліва ярка здольнасці аб’ядноўваць людзей на добрыя і карысныя, не заўсёды прыбытковыя, але дабрачынныя справы праявіліся ў доўгім жыцці Зоські Верас. Афіцэрская дачка і навучэнка рускай гімназіі ў Гродне, у 1909 г. яна арганізавала нелегальны тэатральна-асветніцкі гурток. Гурток існаваў да 1912 г. (да ад’езду Людвікі ў Варшаву на курсы пчалярства) і аб’ядноўваў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гімназістаў і гімназістак. Была таксама малодшая секцыя, дзе вучылі дзяцей чытаць, пісаць, дэкламаваць вершы, спяваць па-беларуску. Раз у месяц ладзіліся вечарыны для дзяцей.

У 1916–1917 гг. Зоська Верас працавала ў Мінскім аддзеле Беларускага камітэта дапамогі пацярпелым ад вайны. У Вільні ў 1924–1929 гг. яна працуе адміністратарам рэдакцыі беларускіх газет, у 1927–1935 гг. рэдагуе дзіцячыя часопісы "Заранка" і "Пралескі". Паралельна ў 1928–1939 гг. старшынствуе ў Беларускім кааператыўным таварыстве "Пчала", рэдагуючы ў 1934–1938 гг. пчалярскі часопіс "Беларуская борць". Зоська Верас склала першы беларуска-польска-расейска-лацінскі батанічны слоўнік, які застаўся адзіным беларускім слоўнікам па батаніцы да 1967 г. У міжваеннай Вільні яна друкавалася ў газеце "Беларуская ніва", у часопісе "Шлях моладзі", у газеце "Жаноцкая справа". Яе пяру належыць таксама шэраг перакладаў.

У гады Першай сусветнай вайны ўдзельніцы беларускага руху (Зоська Верас, Станіслава Корф, Ванда Лявіцкая-Лёсік, Паўліна Мядзёлка, Леаніла Чарняўская) уключыліся ў дзейнасць Беларускага камітэта дапамогі пацярпелым ад вайны. Яны адкрывалі дабрачынныя школы і дзіцячыя прытулкі, працавалі там выхавацелькамі і настаўніцамі, ладзілі дзіцячыя тэатральныя гурткі і тэатры. Пра Станіславу Корф, стваральніцу першага беларускага дзіцячага тэатра, вядома, што ў 1916 г. яна была настаўніцай адной з пяці першых беларускіх школ у Вільні. Яе тэатр аб'ядноўваў дзяцей з беларускіх прытулкаў. Корф сама пісала п'есы для тэатра, рабіла інсцэніроўкі казак, кампазіцыі з батлеечных тэкстаў, народных легенд, даўніх абрадаў.

З дзейнасцю Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны (і непасрэдна з жаночым удзелам у гэтай працы) звязаны знакавы зрух у беларускім адраджэнні: нарэшце ў 1915 г. з'явіліся першыя школы.

З прычыны ўрадавых забаронаў на беларускія школы, літаратура, выдавецкая справа, журналістыка сталі галоўнымі накірункамі адраджэння. Вось чаму ўсе без выключэння вядомыя дзяячкі адраджэння валодалі пяром – пісалі і друкаваліся, складалі чытанкі, перакладалі, стваралі інсцэніроўкі і лібрэта, нарэшце, пісалі мемуары.

Па сваёй адрасацыі гэта не было "жаночай літаратурай" у сучасным разуменні тэрміна. Наадварот, адраджэнскія паэтэсы часта пісалі пад мужчынскімі псеўданімамі: Цётка – пад імёнамі Мацей Крапіўка, Гаўрыла з Полацка, Тымчасовы і інш.; Канстанцыя Буйло – пад імем Эдвард Буйло; Зоська Верас пачынала ў "Нашай Ніве" з псеўданімам Мірко. У Цёткі ёсць вершы, напісаныя як бы ад імя мужчыны: *„Маркотна мне, чужы я людзям"* і *"Ой, як мілы родны край! / Паляцеў бы, як у рай!»* [3, с. 57]. У большасці твораў пісьменніцы беларускага адраджэння звярталіся не да жанчын, а да ўсяго народу – інакш кажучы, пераважна да мужчын. Як слушна адзначае

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Н. Мячкоўская, "зоркі першай велічыні ў беларускай паэзіі XX ст. <…> узышлі над небасхілам па-за межамі гендарных апазіцый і фактараў" [1, с. 258].

Беларускае адраджэнне яшчэ да "Нашай нівы" пачыналася з беларускіх вечарын, з аматарскіх і сямейных спектакляў, з беларускіх песень, дэкламацый і скокаў. Менавіта ў тэатры, у дэкламацыях і спевах чалавек упершыню сустракаўся з публічным беларускім маўленнем. Інакш кажучы, публічнае беларускае маўленне асацыіравалася ў першую чаргу з тэатрам.

Сцэна, жывы чалавечы голас быў больш моцным фактарам нацыянальнага абуджэння, чым друкаванае слова. Успаміны Паўліны Мядзёлкі дазваляюць адчуць той уздым, з якім сяляне сустракалі дэкламацыі па-беларуску. Усе дзеячкі "нашаніўскага" адраджэння так ці інакш былі звязаны з тэатрам. Нават не прыроджаныя актрысы імкнуліся на сцэну. Часта сцэна, хай і аматарская, гімназічная, была вырашальным крокам у пажыццёвую беларускасць. Так было ў Зоські Верас, у Наталлі Арсенневай.

В. Коўтун справядліва адзначае: "Відавочна, што ўсё жаночае ў "нашаніўскім" адраджэнні – "мяккае і светлае", "асабістае і лірычнае" – не было запатрабавана савецкай беларусізацыяй. Праз тэатр, драматургію ішла і значная сувязь беларускага адраджэння з украінскім. У гісторыі нацыянальнага адраджэння ўплыў украінскага тэатра і драматургіі на беларускае мастацтва быў больш шырокім, арганічным і плённым, чым уплыў рускага тэатральнага мастацтва" [2, с. 187].

На арэну барацьбы выходзіць моцная жаночая грамада – работніцы і сялянкі, якія шукаюць шляхі да вызвалення і адукацыі. Да адукацыі імкнуліся ўсе. Вось чаму пачынальніца масавага жаночага беларускага руху, паэтэса вольнага духу і "буры" Цётка была, акрамя ўсяго, і стваральніцай новай канцэпцыі нацыянальнай асветы, у тым ліку жаночай. Выступаючы за правы і годнасць кожнага чалавека як асобы, за незалежнае развіццё ўсёй беларускай нацыі, Цётка карысталася вялікай папулярнасцю ў прадстаўнікоў многіх нацыянальных, дэмакратычных і рэвалюцыйных партый і рухаў. Пры яе актыўным удзеле эпоха нацыянальнага адраджэння пачатку XX стагоддзя рашала задачы легітымізацыі беларускай мовы, прэсы і культуры. І жанчыны, якія ў гэтым удзельнічалі, былі натхнёныя найперш нацыянальнай ідэяй.

Паўліна Мядзёлка, Зоська Верас, Надзея Шнаркевіч, Апалонія Гіркант, Канстанцыя Буйло, Палута і Марыя Бадуновы, Казіміра Яноўская, Леаніла Гарэцкая, Уладзіслава Мілковіч і іншыя лічылі сваім абавязкам не толькі змагацца за народную волю, але таксама будзіць нацыянальнае пачуццё дзяржаўнасці. Яны адкрывалі першыя беларускія школы і чытальні, пісалі беларускія вершы для дзяцей, стваралі гурткі і хоры, ставілі перад сабою дабрачынныя мэты – адным словам, пераносілі свае мацярынскія абавязкі ў сям'ю, прасторава-часавыя межы якой набывалі ўжо дзяржаўныя абрысы. Яны марылі абудзіць у



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

беларускай жанчыне жаданне выхоўваць у новых пакаленняў цвёрдую волю і рашучасць змагання за новую незалежную радзіму.

Такім чынам, першае беларускае нацыянальнае адраджэнне выклікала да жыцця і грамадска-культурны і літаратурны рух беларускіх жанчын, якія ўпісалі яркія старонкі ў яго гісторыю, а сваёй асветніцкай, літаратурнай і міласэрнай дзейнасцю яны выяўлялі лепшыя культурныя рысы беларускіх жанчын, спрыялі фарміраванню ў іх пачуцця чалавечай і нацыянальнай годнасці, развіццю інтэлектуальнага патэнцыялу ў новых гістарычных умовах.

**Літаратура**


1. Мячкоўская, Н. Гендэрны аспект у гісторыі Першага беларускага адраджэння (1906–1928): жаночыя лёсы і ўплывы / Н. Мячкоўская // Studia Białorutenistyczne. – 2007. – № 1. – С. 249–263.
2. Коўтун, В. Жаночы рух : гісторыя развіцця / В. Коўтун // Полымя. – 1997. – № 6. – С. 182–193.
3. Цётка. Выбраныя творы / Цётка ; уклад., прадм. В. Коўтун. – Мінск : Белар. кнігазбор, 2001. – 336 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова